Зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов
Республики Беларусь 8 ноября 2001 г. N 5/9332

---

# ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
**2 лістапада 2001 г. N 1609**

## АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ ПАЛАЖЭННЯ АБ ПАРАДКУ НАДАННЯ ЗВАННЯ "ЗАСЛУЖАНЫ АМАТАРСКІ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ"

(в ред. постановления Совмина от 29.09.2004 N 1222)

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Зацвердзіць прыкладзенае Палажэнне аб парадку надання звання "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь".

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Г.НАВІЦКІ

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
02.11.2001 N 1609

## ПАЛАЖЭННЕ
## АБ ПАРАДКУ НАДАННЯ ЗВАННЯ "ЗАСЛУЖАНЫ АМАТАРСКІ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ"

(в ред. постановления Совмина от 29.09.2004 N 1222)

Званне "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" надаецца непрафесійнаму (аматарскаму) калектыву мастацкай творчасці (тэатральнаму, вакальна-харавому, харэаграфічнаму, музычна-інструментальнаму, цыркавому, дэкаратыўна-прыкладному, выяўленчаму і інш.), які ажыццяўляе канцэртную і выставачную дзейнасць, фальклорнаму калектыву, якія маюць найменне "народны (узорны) аматарскі калектыў" (далей - калектыў).
(часть 1 в ред. постановления Совмина от 29.09.2004 N 1222)

Агульнымі крытэрыямі для вылучэння калектыву мастацкай творчасці, які ажыццяўляе канцэртную і выставачную дзейнасць, на наданне звання "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" з'яўляюцца:
(абзац 1 части 2 в ред. постановления Совмина от 29.09.2004 N 1222)

высокі выканальніцкі ўзровень;

стабільная творчая дзейнасць на працягу 10 гадоў;

актыўная канцэртная дзейнасць, пастаяннае абнаўленне рэпертуару;

неаднаразовае атрыманне лаўрэацкага звання на міжнародных і рэспубліканскіх аглядах і фестывалях народнага мастацтва (дзе выступленні адбываюцца на конкурснай аснове), што пацвярджаецца спецыяльным дыпломам;

статус базавага калектыву па аказанню метадычна-кансультацыйнай дапамогі ў дадзеным відзе мастацкай творчасці;

наяўнасць рэкламна-інфармацыйнай прадукцыі аб сваім калектыве (аўдыё-, відэазапісы, запісы на электронных носьбітах, буклеты, афішы, фотаздымкі, водгукі сродкаў інфармацыі і інш.).

Калектыў мастацкай творчасці ў сваім пастаянным выканальніцкім рэпертуары выкарыстоўвае не менш як 1/3 ад яго агульнага аб'ёму арыгінальных мясцовых фальклорных твораў, жывое музычнае суправаджэнне, касцюмы, якія адпавядаюць мясцовым традыцыям. Калектыў сталіцы рэспублікі і абласных цэнтраў можа выкарыстоўваць творы розных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.
(часть 3 в ред. постановления Совмина от 29.09.2004 N 1222)

Агульнымі крытэрыямі для вылучэння фальклорнага калектыву на наданне звання "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" з'яўляюцца:
(абзац 1 части 4 в ред. постановления Совмина от 29.09.2004 N 1222)

высокі выканальніцкі ўзровень;

стабільная творчая дзейнасць на працягу 10 гадоў;

неаднаразовае атрыманне лаўрэацкага звання на міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных аглядах, фестывалях, конкурсах і святах фальклорнага мастацтва, што пацвярджаецца спецыяльным дыпломам;

валоданне мясцовай (розных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак) аўтэнтычнай манерай выканання;

наяўнасць народных касцюмаў - аўтэнтычныя або зробленыя ў адпаведнасці з мясцовай традыцыяй;

рэгулярная пошукава-збіральніцкая і краязнаўчая работа;

супрацоўніцтва з навукова-даследчымі ўстановамі, метадычнымі цэнтрамі адпаведнага профілю;

наяўнасць фана-, відэа-, фотазбораў.

Для калектыву, які створаны ў гарадах раённага падпарадкавання, пасёлках гарадскога тыпу і сельскіх населеных пунктах, абавязковым з'ўляецца наяўнасць мясцовага рэпертуару (песні каляндарна-земляробчага і сямейна-абрадавага цыклаў, пазаабрадавая лірыка, танцы, гульні, народная проза і іншыя творы), вядзенне папулярызатарскай дзейнасці, у тым ліку і праз удзел у масавых відовішчных мерапрыемствах.

Хадайніцтва аб наданні калектыву звання "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" накіроўваецца абласным выканкамам (Мінскім гарвыканкамам), Міністэрствам адукацыі, іншымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі у Міністэрства культуры.
(часть 6 в ред. постановления Совмина от 29.09.2004 N 1222)

Да хадайніцтва аб наданні калектыву звання "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" дадаюцца:

пашпарт калектыву;
(абзац 2 части 7 в ред. постановления Совмина от 29.09.2004 N 1222)

інфармацыя аб творчай дзейнасці калектыву (у двух экзэмплярах);

спіс рэпертуару (план работы);

спіс удзельнікаў калектыву з указаннем месца працы (вучобы), той ролі, якую выконвае ўдзельнік у калектыве;

рэкламна-інфармацыйная прадукцыя апошніх пяці гадоў выдання;
(абзац 6 части 7 в ред. постановления Совмина от 29.09.2004 N 1222)

водгукі сродкаў масавай інфармацыі;

копіі дыпломаў лаўрэата міжнародных і рэспубліканскіх аглядаў, фестываляў, конкурсаў і свят.
(абзац 8 части 7 в ред. постановления Совмина от 29.09.2004 N 1222)

Прагляд мастацкай (канцэртнай, выставачнай) праграмы калектыву-прэтэндэнта (працягласцю не больш трыццаці хвілін) ажыццяўляецца па рашэнню Міністэрства культуры спецыяльнай камісіяй адзін раз у год.
(часть 8 в ред. постановления Совмина от 29.09.2004 N 1222)

Званне "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" надаецца рашэннем калегіі Міністэрства культуры.

У залежнасці ад спецыфікі жанру за кошт сродкаў ад правядзення платных мерапрыемстваў, аказання паслуг, розных відаў работ, якія не забаронены заканадаўствам, іншых паступленняў у калектыве можа ўтрымлівацца дадаткова неабходная колькасць творчых работнікаў і работнікаў, якія ажыццяўляюць тэхнічнае абслугоўванне.

Працягласць працоўнага часу кіраўніка калектыву са званнем "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" устанаўліваецца згодна з Працоўным кодэксам Рэспублікі

Беларусь. У аб'ём працоўнага часу кіраўніка калектыву ўваходзіць арганізацыйна-творчая, вучэбна-творчая, рэпетыцыйная і канцэртная работа з калектывам (у тым ліку групавыя і індывідуальныя заняткі), падбор рэпертуару, музычнага і іншага матэрыялу, работа са спецыяльнай літаратурай, складанне кампазіцый танцаў, сцэнарыяў, аранжыроўка і апрацоўка твораў, работа з мастакамі над эскізамі касцюмаў, самападрыхтоўка, удзел і наведванне гарадскіх, раённых аглядаў, фестываляў і конкурсаў, семінараў і нарад, якія звязаны з яго прафесійнай дзейнасцю, іншыя віды работ.

Калектыву са званнем "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі і кіраўніцтвам базавых устаноў (арганізацый) першачаргова ствараюцца спрыяльныя ўмовы для творчай дзейнасці, умацавання іх матэрыяльна-тэхнічнай базы (выдзяляюцца асобныя памяшканні, сродкі для набыцця сцэнічных касцюмаў, абсталявання, гукаўзмацняльнай тэхнікі, вырабу рэкламна-інфармацыйнай прадукцыі і інш.).

У мэтах павышэння творчага і выканальніцкага ўзроўню, ажыццяўлення гастрольна-канцэртнай і выставачнай дзейнасці калектыву са званнем "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" могуць выдзяляцца дзяржаўны заказ, гранты для падрыхтоўкі новых мастацкіх (канцэртных, выставачных) праграм, набыцця неабходных музычных інструментаў, сцэнічных касцюмаў, апаратуры, абсталявання і іншых патрэб, выдавацца рэкамендацыі, накіраванні для ўдзелу ў прэстыжных міжнародных форумах народнага мастацтва.

Калектыву са званнем "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" уручаецца спецыяльны дыплом. Назва калектыву павінна пачынацца са слоў "Заслужаны аматарскі калектыў.

(часть 14 в ред. постановления Совмина от 29.09.2004 N 1222)

Калектыў са званнем "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" пацвярджае сваё званне адзін раз у пяць гадоў, паказваючы пры гэтым не менш як 70 працэнтаў абноўленага рэпертуару. Парадак пацвярджэння адпавядае патрабаванням аб прысваенні звання "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь".

Пазбаўленне звання "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" ажыццяўляецца на падставе заключэння рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі рашэннем калегіі Міністэрства культуры ў выпадку, калі дзейнасць калектыву перастала адпавядаць патрабаванням дадзенага Палажэння.